View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# Функцыянальнасць апісанняў прыроды ў паэмах ваеннага часу Якуба Коласа

Праз усю творчасць Якуба Коласа праходзяць тэмы бацькаўшчыны і прыгажосці роднай прыроды. “Радзіма ў творчасці пісьменніка выступае ў рэальным, гістарычна-канкрэтным плане, з яе лясамі, палямі, рэкамі, з яе сацыяльна-палітычным ладам, з яе працавітым народам: яна акрэсліваецца пэўным часам і прасторай” [1, с. 195]. Пейзажныя малюнкі ў творах Коласа выконваюць выключную ролю ў стварэнні яскравых вобразаў роднага краю, адлюстраванні жыцця народа, раскрыцці ўнутранага свету герояў.

Па-новаму ў параўнанні з даваеннай і асабліва дарэвалюцыйнай творчасцю пісьменніка раскрываюцца гэтыя тэмы ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, калі Якубам Коласам былі напісаны некалькі зборнікаў вершаў і дзве паэмы “Суд у лесе” (1942) і “Адплата” (1944). Дамінуючай у творах становіцца тэма абароны радзімы, новыя функцыі набывае і пейзаж. Як адзначыў М. Арочка ў манаграфіі “Паэзія і вайна”: “Прырода адухоўлена тут вялікім патрыятычным пачуццём, асобныя яе карціны створаны на ўзроўні, бадай, пейзажнага майстэрства вяршыннай эпапеі Якуба Коласа “Новая зямля”. Але ўжо з выхадам у новае светаадчуванне” [5, с. 67 – 68]. Даследчыца Т. Грамадчанка паглыбляе гэта выказванне: “Сутнасцю яго стала ўзбуйненае маштабна-прасторавае, можна сказаць касмічна-планетарнае бачанне пісьменнікам асяроддзя, у якім існуе чалавек” [2, с. 27]:

Зямля ж, бы крупінка адна
У гмаху бязмежным сусвету,
Разгойдана ўся аж да дна”. [3, с. 315]

У паэмах Якуба Коласа “Суд у лесе” і “Адплата” прырода разглядаецца ў рэальнай і цеснай залежнасці ад ваенных умоў. У адзінае цэлае спалучаюцца маштабны трагізм вайны, абагулены вобраз паўстаўшай народнай партызанскай масы і адухоўленая прырода, якая дапамагае партызанам помсціць ворагу, знішчаць яго, гнаць са сваёй зямлі:

Мой брат беларус! Тваёй сіле,
Цярпенню твайму – пакланіцца.
У цяжкай хвіліне, у болю,
Пад здзекам брыды-чужаніцы
Выхоўваеш ты сваю волю
І свята вартуеш граніцы.
У дзікіх трушчобах, у пушчах,
У нетрах патайнага схову
Дарогай сваёй невідушчай
Снуеш ты збавення аснову… [3, с. 354]

Якуб Колас будуе паэмы такім чынам, што з аднаго боку, яго героі-партызаны паказаны актыўнымі барацьбітамі з фашызмам, а з другога – у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адзінстве з навакольным светам. Уся беларуская прырода з яе лясамі, пушчамі, балотамі, нівамі выступае ў творах побач з чалавекам адной з галоўных дзеючых асоб, якая далучаецца да барацьбы з ворагам, становіцца часовым сховішчам партызан, аказвае ім вялікую маральную падтрымку:

Мне лес цяпер міл удвая,
Бо родны лес мой краю служыць,
Бо лес мой туліць смелых, дужых,
Сярод якіх душой і я.  [3, с. 271]

Прырода ў коласаўскіх паэмах не проста “ажыўляецца”, яна ачалавечваецца. Як і людзі, прырода аплаквае разбураныя, спаленыя фашыстамі вёскі, знішчаныя сады і палеткі, пранізаную ранамі зямлю. Праз яркія прыклады мы бачым, што ў час ваеннага ліхалецця асірацелі не толькі людзі, але і ўсё навакольнае асяроддзе:

Узлескам праходзіць дарога.
Маркотна і глуха на ёй.
За Свіслаччу жэрдка ад стога,
Як тычка, стаіць сіратой.

Налева з дарогі – сядзіба,
Але не відаць яе хат.
Пасёлак – счарнелая глыба
І плешын абвугленых рад. [3, с. 283]

Малюнкі прыроды часам набываюць у паэмах іншасказальны сэнс. Як і ў многіх папярэдніх творах, Колас выкарыстоўвае тут разнастайныя вобразы-сімвалы. Праз вобраз камня паэт раскрывае моц і нязломнасць духу беларускага народа, які змог вынесці ўсё, што выпала на яго долю:

Сцярпець толькі могуць каменні
Той глум і той здзек.  [3, с. 289]

Вялікую эмацыянальную і сэнсавую назрузку нясуць і шматлікія апісанні дубоў, сосен, бяроз і іншых дрэў. Але дамінуючым у выкарыстанні пісьменнікам з’яўляецца вобраз дуба, які для Якуба Коласа найперш – сімвал Радзімы, а таксама ўвасабленне мужнасці, цвёрдасці, велічы і жыццёвай моцы. Дуб у творах прадстае ў розных abліччах. З аднаго боку – дуб-крапак, які сваім шатром прыкрывае партызанскую рацць, ахоўвае беларускіх людзей.  З другога – шчыры спачувальнік, суперажывальнік народнага гора:

Разбураны сёлы, мястэчкі,
Пажоўклі сады,
Як слёзы, раняюць у рэчку
Дубы жалуды.  [3, с. 257]

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

Вобраз жа суцэльнай дубровы сімвалізуе з'яднанасць усяго беларускага народа супраць чужынцаў, перамогу сапраўдных героеў-змагароў.

У абедзвюх паэмах сустракаецца і шмат супрацьлеглых вобразаў-сімвалаў: сонца – цемра, дарога – багна, квітнеючая зямля – пустыня, вецер – туман, руіны – маладая зелень і інш. Выкарыстаннем прыёма антытэзы Якуб Колас яшчэ больш паглыбіў адлюстраванне трагічнага становішча беларускага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны. Пісьменнік паказвае, што ўсё прыроднае, прыгожае цесна ўзаемазвязана з грамадскім, сацыяльным. Сонца, якое звычайна сімвалізуе светлае, шчаслівае жыццё, было парушана змрочнымі, злымі сіламі. Але голас паэта гучыць аптымістычна, у паэме "Суд у лесе" Колас сцвярджае:

Смерць фашысцкаму ярму,
Сонца вечна людзям свеціць.
Хто прыйшоў з цьмы, сойдзе ў цьму! [3, с. 255]

Пейзажны вобраз дарогі набывае ў ваенных паэмах глыбокі філасофскі змест. Дарога становіцца для многіх герояў Коласа ўвасабленнем духоўных шуканняў і выбару. Сапраўдныя патрыёты ў паэмах цвёрда і ўпэўнена крочаць па дарогах і сцяжынах роднай зямлі, акупіраванай фашыстамі, ніколі не зварочваючы на крывы шлях. Прыстасаванцы ж і здраднікі, такія як Жыгун і Цімох, наадварот, паступова ўсё больш зацягваюцца ў дрыгвяную багну, зямля больш не можа іх насіць на сабе. Коласаўскі здраднік Жыгун мізарнее да вобраза тлі. "Ён не чалавек ужо – тля" [3, с. 319], падкрэслівае пісьменнік.

Вобразы вясны, ветру, свежай руні каля спаленых хат, золака, навальніцы, сонца і зорак становяцца ў творах сімваліка-алегарычным увасабленнем ідэі вызвалення краіны ад фашысцкіх захопнікаў і ўстанаўлення новага, мірнага жыцця:

Разгоніць дзень туман крывавы,
Развее вецер чад імжы,
І будзе праўда правіць права,
Пазносіць межы, рубяжы.

Пра вас жа, волаты – героі,
Гатовых кроў за край аддаць,
Шумець век векам будуць хвоі
І гімны славы вам складаць. [3, с. 280]

Вясна ў паэта – жывая істота, якая павінна прыйсці хутчэй і абагрэць людзей, дапамагчы ім аднавіць жыццё. Якуб Колас сцвярджае, што "нельга спыніць жыцця прыроды, бо яно мае ўласцівасці ўнутранага жыцця, самаразвіцця. На чорных, асмаленых кавалках зямлі неўзабаве паказваецца зялёная трава. Тым больш нельга спыніць або перайначыць жыцця савецкіх людзей. Усенародная партызанская барацьба, гатоўнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кожнага грамадзяніна змагацца за незалежнасць савецкай краіны сведчаць аб гэтым. <…> На пустым месцы паміж дрэў і хмызнякоў вырастаюць зямлянкі, шалашы, пабудаваныя дбалай рукой працоўнага чалавека-партызана” [1, с. 212] .

Нягледзячы на сюжэтную спрошчанасць паэм “Суд у лесе” і “Адплата”, у якіх фактычна адлюстраваны два “суды ў лесе”, яны вызначаюцца “эстэтычнай каштоўнасцю “смутку па роднай зямлі” як глыбока лірычнага перажывання за лёс народа. Нават пейзажнае апісанне партызанскай пушчы, прасякнутае тонкім філасофскім лірызмам, уздзейнічала, як патрыятычны заклік” [5, с. 67]. У прыродзе – вольнай, свабоднай, моцнай чалавек чэрпае сілы для змагання, вучыцца жыць:

Люблю я лес, адвечны бор,
Дзе ўзносяць хвоі ўгору шапкі,
Дзе рассцілаюць елі лапкі
І вострыверх мкнуць у прастор.

Мне не забыць і тых часін,
Калі шумяць трывожна дрэвы,
А ў кожным дрэве свае спевы,
А ў хоры іх акорд адзін [3, с. 270 – 271]

Як адзначыў літаратуразнаўца М. Мушынскі, “Колас-пейзажыст – гэта перш за ўсе мастак-філосаф, які ўмеў схопліваць жыццё ва ўсім багацці яго змен, у руху і разам з тым у яго цэласнасці” [4, с. 5]. У творах пісьменніка нават ваеннага часу выразна адчуваецца адзінства чалавека і навакольнага свету. Гарманічным адносінам у прыродзе супрацьпастаўлены разбуральныя сілы вайны:

На зямлю апусцілася ноч,
Раскрыла свае аканіцы.
У небе пралёг наўзвалоч
Шлях млечны святлом таямніцы.

Снуецца, як чорны прывід,
Пякельная, цёмная сіла.
Дзе ступіць – дом спален, разбіт.
Дзе спыніцца – крыж і магіла. [3, с. 295]

Мы бачым, як велічная і мудрая прырода чуйна рэагуе на ўсе трагічныя падзеі і сама паступова мяняецца, становіцца змрочнай, чорнай, абяздоленай ад вялікага гора, як на параненую зямлю з забітымі людзьмі злятаюцца спраўляць свой пір крумкачы, прадвеснікі смерці:

Над лесам снуецца крумкач
І будзіць заглухлыя крэсы –
Над лесам смуга, нібы пыл,
І лес нешта страшнае тоіць. [3, с. 316]

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пейзажныя замалёўкі ў “партызанскіх” паэмах дапамагаюць раскрыць сутнасць характару, адцяняюць адчуванні, настрой, стан герояў. “Напружанае імгненне цішыні, заміранне прыроды перад наплывам свінцова-чорных хмар псіхалагічна адцяняе трывожны стан душы партызан-падрыўнікоў у час пачатка баявой аперацыі. Наляцеўшыя навальнічныя віхуры сімвалізуюць буйства разбуральных стыхій, ахапіўшых свет [5, с. 68]:

Трапечуцца дрэвы, кусты ў дзікім тлуме,
Размахваюць, б’юцца галінай,
Губляюцца громы ў тым жудасным шуме,
У песнях знішчэння, у буйстве і глуме. [3, с. 344]

Такім трывожным светаадчуваннем прасякнуты многія радкі паэм. Але заканчваюцца абодва творы аптымістычна і жыццесцвярджальна – Беларусь стане вольнай краінай, якая зможа адрадзіцца і раскрытнецца:

На гэтых землях вораг люты
Пахован будзе без труны,
Як тая горкая атрута,
Дзе ўсходзяць толькі палыны. [3, с. 280]

Прырода ў паэмах увесь час абнаўляецца. Такой жа прагай абнаўлення жыве і беларускі народ. Яго зліццё з прыродай сімвалізуе хуткую і вялікую перамогу над фашызмам. І толькі курганы застануцца адзіным напамінам аб мужнасці і гераізме беларусаў у час Вялікай Айчыннай вайны. “Курганы – жывы напамін аб славе бацькоў для патомкаў” [3, с. 394].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Літаратура**

1. Барсток, М.Н. Вобраз станоўчага героя ў творчасці Якуба Коласа / М.Н. Барсток. – Мінск: Выд. Акадэміі Навук БССР, 1951.
2. Грамадчанка, Т.К. Ліра-эпас Якуба Коласа: Да праблемы сучаснага прачытання / Т.К. Грамадчанка. – Шостыя Танкаўскія чытанні. Да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа і 95-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка: зб.навук. артыкул. – Мінск: БДПУ, 2008. – С. 26 – 28.
3. Колас, Я. Збор твораў: у 12 т. Т. 8 / Я. Колас. – Мінск: Дзяржвыд. БССР, 1963.
4. Мушынскі, М.І. Чалавек і прырода ў апавяданнях Якуба Коласа / М.І. Мушынскі. – Каласавіны. Матэрыялы навук. канферэнцыі “Праблемы рацыянальнага выкарыстання і захавання прыродных ландшафтаў мемарыяльных музейных аб’ектаў”. – Мінск: ВПП імя Я. Коласа, 1999. – С. 3 – 14.
5. Орочко, Н.Н. Поэзия и война / Н.Н. Орочко. – Минск: Наука и техника, 1987.